## Уводзіны

У апошні час у Ашмянскім раёне актыўна развіваецца ўнутраны турызм. Ашмяншчына стала вядома сваімі турыстычнымі аб'ектамі: гэта і Гальшанскі замак, магіла і помнік Ф. Багушэвічу ў вёсцы Жупраны, і знакамітыя людзі Ашмяншчыны ў галіне навукі і літаратуры (Ч.Янкоўскі,А. Адынец,А. Снядэцкі, З. Мінейка, Р. Ануфрыева, П. Шакола, В. Ліштван і іншыя).

**Актуальнасць і навізна даследавання** абумоўлена тым, што Ашмяншчына багата літаратурнымі імёнамі, якіх, на жаль, мясцовая моладзь не ведае. Прычыны ў тым, што моладзь страчвае цікавасць да папяровай кнігі. Акрамя таго, выданне кніг – гэта доўгі працэс, які патрабуе вялікіх матэрыяльных затрат. Творы многіх сучасных пісьменнікаў застаюцца невядомымі шырокаму колу чытачоў па прычыне адсутнасці друкаваных зборнікаў. Таму і былі сабраны ў адзінае цэлае надрукаваныя ў сродках масавай інфармацыі і знойдзеныя ў сетцы інтэрнэт творы дваццаці двух паэтаў Ашмяншчыны, вывучаны іх біяграфіі, сістэматызаваны ўсе звесткі, чаго да гэтага часу не было зроблена. І ўся гэта інфармацыя змешчана ў інтэрнэце, які так трывала ўвайшоў у сучаснае жыццё.

**Аб'ект даследавання –** літаратурная Ашмяншчына.

**Прадмет даследавання –** творы паэтаў Ашмяншчыны.

У выніку атрымаліся літаратурныя велавандроўкі па родным краі. Работа накіравана на павышэнне цікавасці да чытання і захаванне здароўя праз велавандроўкі па літаратурных мясцінах Ашмяншчыны. Тым больш, у наш час набірае папулярнасць веласпорт.

**Мэта работы** - захаванне літаратурнай спадчыны малой радзімы.

Зыходзячы з мэты, вызначылі наступныя **задачы:**

1. Вывучыць гісторыю роднага краю.
2. Пазнаёміцца з паэтамі, якія жылі і пражываюць у Ашмянскім раёне.
3. Скласці максімальна зручныя літаратурныя веламаршруты па Ашмяншчыне.

Для стварэння работы былі вызначаны **асноўныя метады працы:**

1. Збор і вывучэнне матэрыялаў (літаратуры па тэме, выкарыстанне інтэрнэт-крыніц, СМІ, паездкі па маршрутах, сустрэчы з паэтамі).
2. Апрацоўка і сістэматызацыя атрыманых дадзеных, стварэнне віртуальнай велаэкскурсіі.
3. Папулярызацыя маршруту: прэзентацыя праекта для вучняў школы, публікацыі ў СМІ, у інтэрнэце, афармленне буклетаў.

**Гіпотэза:** развіваць цікавасць моладзі да мастацкіх твораў мясцовых пісьменнікаў праз здзяйсненне літаратурных велавадровак па родным краі.

Для вывучэння літаратурнай спадчыны Ашмяншчыны былі ўзяты звесткі з гістарычна-дакументальнай хронікі “Памяць. Ашмянскі раён”, вялося цеснае супрацоўніцтва з рэдакцыяй раённай газеты “Ашмянскі веснік”, на старонках якой друкуюцца творы мясцовых паэтаў.

## Асноўная частка

## 1. Структура веламаршрутаў

### 1.1. Стварэнне маршрутаў

Пазнаёміўшыся з асобнымі старонкамі гісторыі Ашмяншчыны, выявіўшы знакамітыя літаратурныя імёны, былі распрацаваны літаратурныя веламаршруты па роднаму краю:

Першы “Сцежкамі Францішка Багушэвіча”: Ашмяны - Паляны - Жупраны - Станцыя Ашмяны - Дакурнішкі.

Другі “Барунскі”: “Ашмяны - Навасёлкі - Гінеўцы - Баруны - Гейстуны.

Трэці “Шляхам жыцця”: Ашмяны - Навасяды - Кальчуны - Мардасы - Вайшнарышкі.

Чацвёрты “Да руінаў старажытнасці”: Ашмяны - Гальшанах – Маркіняты (Дадатак 1).

Для праходжання маршрутаў быў абраны велапаход, які так імкліва набірае папулярнасць сярод моладзі. Да кожнага маршруту пралічаны кіламетраж і затрачаны час праезду ад пункта да пункта на веласіпедзе. Стартавым пуктам з’яўляецца цэнтр горада Ашмяны.

Спыняючыся падчас velавандроўкі на пэўным пункце маршруту, падарожнік мае магчымасць пpагледзець відаэролікі і фотаздымкі той ці іншай мясцовасці, прачытаць інфармацыю пра мясцовых паэтаў, праслухаць іх творы з дапамогай уласных мабільных сродкаў.

### 1.2. Структура сайта

Для зручнасці карыстання сабранай інфармацыі быў створаны электронны комплекс “Цудоўная і непаўторная Ашмяншчына”, які змешчаны ў сетцы інтэрнэт.

Электронны комплекс змяшчае карту з веламаршрутамі, аўдыягіды да іх, галерэю, відэа, карысныя спасылкі.

Кожны маршрут складаецца з наступных раздзелаў:

1. Славутасці (Дадатак 2).
2. Відэаролікі і фотаздымкі мясцовасці (Дадатак 3).
3. Мясцовыя паэты, якія жылі, пачынаючы з сярэдзіны XIX стагоддзя і да нашых дзён: біяграфія, вершы, відэа і фота (Дадатак 4).
4. Аўдыягіды (Дадатак 5).

Галоўная старонка сайта змяшчае фотаздымкі Ашмяншчыны, паэтычныя радкі пра Ашмяншчыну мясцовых пісьменнікаў, карысныя спасылкі. Напрыклад, ёсць спасылка на электронную бібліятэку “Беларуская палічка”, у якой можна знайсці творы некаторых пісьменнікаў Ашмянскага раёна.

Спасылка на сусветную вольную энцыклапедыю “Вікіпедыя” змяшчае дадатковую інфармацыю пра населеныя пункты нашага раёна. Ёсць спасылкі на ўстановы адукацыі Ашмянскага раёна, якія звязаны з тым ці іншым пісьменнікам. Напрыклад, на сайце Жупранскай сярэдняй школы знаходзіцца віртуальны Літаратурны музей Францішка Багушэвіча.

Літаратурныя маршруты з пунктамі прыпынкаў на карце пазначаны рознымі колерамі. На кожным пункце карты змешчаны фотаздымак мясцовага паэта.

**1.3. Структура маршрутаў**

У кожным маршруце падарожнік мае магчымасць даведацца, які прыблізны кіламетраж складзе яго велапаход, а таксама прыкладны затрачаны час ад стартавага пункта да канцавога і назад.

Асаблівасць комплексу ў тым, што маршруты змяшчаюць аўдыягіды, якія ў аўтарскай паэтычнай або празаічнай форме распавядаюць пра населены пункт, яго славутасці і знакамітыя імёны.

У раздзеле “Славутасці” турыст зможа атрымаць інфармацыю пра тое, якімі турыстычнымі аб’ектамі багата мясцовасць.

Раздзел “Відэа” зробіць падарожжа больш разнастайным. У гэтым раздзеле можна прагледзець відэа пра населены пункт, пра  знакамітую асобу або пра сучаснага паэта.

Самы галоўны і каштоўны для літаратурнай спадчыны Ашмяншчыны раздзел – гэта “Паэты”. Для кожнага паэта родная вёска з’яўляецца калыскай натхнення. Пазнаёміўшыся з паэтам або паэтэсай завочна праз фотаздымкі, кожны жадаючы можа прайсці сцежкамі жыцця мастака слова, зазірнуўшы ў падраздзел “Біяграфія” (Дадатак 6).

Падраздзел “Вершы” дапаможа аматарам паэзіі дапоўніць партрэт мясцовай знакамітасці праз прачытанне твораў. Выключнасць гэтага падраздзела ў тым, што можна пачуць голас самога паэта, які дэкламуе свае вершы. Акрамя таго, вершы мясцовых паэтаў гучаць і ў выкананні вучняў нашай школы ( Дадатак 7).

Стартавы пункт кожнага маршруту - горад Ашмяны. У горадзе Ашмяны пражываюць паэты: Галіна Даўгашэй, Валянціна Васюкевіч, Святлана Муха, Наталля Грыгор’ева (Гардзей), Рамуальда Ануфрыева, Яніна Гардзей (Дадатак 8).

У горадзе Ашмяны жыў самадзейны паэт Пётр Шакола, які, на жаль, пайшоў з жыцця.

Нарадзіўся паэт ў Ашмянах у 1946 годзе. Працаваў інспектарам аддзела сацзабеспячэння, старшым эканамістам інфармацыйна-вылічальнай станцыі,

інструктарам райвыканкама і райкама партыі. Дваццаць гадоў аддаў педагагічнай дзейнасці - працаваў настаўнікам, завучам і дырэктарам школ раёна. Захапляўся літаратурай, музыкай, спортам (у маладосці адстойваў гонар раёна на розных спаборніцтвах).

Дзе б ні працаваў Пётр Валяр’янавіч, заўсёды з ім былі вершы, а першыя вершы з’явіліся яшчэ ў дзяцінстве. Штуршком да творчасці стала паэзія М.Багдановіча, С.Ясеніна. Выдаў дастатковую колькасць кніг са сваімі вершамі і паэмамі. [12, с.591]

Тэматыка яго паэзіі шматгранная. Шмат вершаў патрыятычнай накіраванасці, прысвечаных роднаму гораду і ашмянскай зямлі.

Край мой родны, скажу без падману:
Куды б сцежкі твае ні вялі,-
Я душой прыкіпеў да Ашмянаў,-
Няма лепшай на свеце зямлі!

Значнае месца ў паэзіі аўтара займае тэма кахання.

Пётр Шакола сябраваў з мясцовым самадзейным ашмянскім кампазітарам М.Разенберг. Многія вершы паэта пакладзены на музыку (“Прывітальная”, “Маёй каханай”, “Любімыя Ашмяны”).

На памятным камяні, які быў закладзены ў гонар 665-годдзя Ашмян, выбіты словы з верша П.Шаколы “Усхваленне Радзімы”: “Любы горад, красуй у стагоддзях!”.

## 2. Літаратурныя велавандроўкі

### 2.1. Маршрут першы “Сцежкамі Францішка Багушэвіча”

Ты – Багушэвіча зямля,
Часцінка роднай Беларусі.
Ты – любы кут, Радзіма ты мая,
Табой я заўсёды ганаруся.

Ашмяны - Паляны - Жупраны - Станцыя Ашмяны - Дакурнішкі.

Агульная адлегласць – каля 52,2 км.

Агульны затрачаны час - 132 хвіліны, або 2 гадзіны 12 хвілін.

**Першы прыпынак: вёска Паляны**

Адлегласць: з г. Ашмяны да в. Паляны - 8,2 км; час - 21 хвіліна.

Вёска Паляны славіцца сядзібай Янкоўскіх (XIX ст.). [5]

У вёсцы нарадзіўся Чэслаў Янкоўскі - польскі паэт, крытык, публіцыст, гісторык-краязнавец. Пісаў лірычныя вершы, літаратурныя нарысы, займаўся перакладамі. Пісаў лірычныя вершы, літаратурныя нарысы, займаўся перакладамі.

Самыя вядомыя яго твораў: «Постаці паэтаў» (Postaci poetów, 1891), «З нататак турыста» (1892), «Па Еўропе. Карткі з падарожжа» (Po Europie. Kartki z podróży, 1893), «Арабескі» (Arabeski, 1894), «На ўзбочыне літаратуры» (1906), «З дні ў дзень» (Z dnia na dzień. 1914 Warszawa 1914—1915 Wilno; Вільня, 1923), «З чачоткавай шкатулкі» (1926). Таксама аўтар 4-томавага даследавання «Ашмянскі павет» (Powiat Oszmiański, 1896—1900); «Польскі народ і яго Бацькаўшчына» (Narod polski i jego Ojczyzna; Варшава, 1914), «Этнаграфічная Польшча» (Polska etnograficzna; Варшава, 1914); мемуараў «На працягу двух гадоў…» (W ciagu dwoch lat…, Варшава, 1908), «На вастрыі справядлівасці» (Na ostrzu sprawiedliwosci; Варшава, 1918). [2] (Дадатак 9).

**Другі прыпынак: аграгарадок Жупраны**

Адлегласць з в. Паляны да аг. Жупраны – прыкладна 18,2 км; затрачаны час - 46 хвілін.

У гэтай мясцовасці знаходзяцца магіла і помнік паэту Ф. Багушэвічу.

Францішак Багушэвіч - беларускі паэт, празаік, публіцыст і перакладчык, журналіст, адвакат.

Першымі вядомымі паэтычнымі спробамі Францішка Багушэвіча лічаць знойдзеныя ў Львове вершы на польскай мове: «Новы 1886 год», «Прывід надзеі», «Хто гэта?» («Nowy rok 1886», «Widmo nadziei», «Kto to?»), напісаныя ў 1885—1886 г.

У 1891 г. у Кракаве выходзіць першы зборнік паэта «Дудка беларуская» пад псеўданімам Мацей Бурачок. Пры жыцці паэта пад псеўданімамі былі надрукаваны вершаваны зборнік «Смык беларускі» (Познань, 1894) і апавяданне «Тралялёначка» (Кракаў, 1892).

У мясцовай школе створаны літаратурны музей, які прысвечаны жыццю і творчасці паэта. Практычная значнасць работы літаратурнага музея Ф.К.Багушэвіча заключаецца ў магчымасці выкарыстання матэрыялаў на ўроках роднай мовы і літаратуры, гісторыі, у выхаваўчай рабоце, а таксама пры напісанні даследчых прац (Дадатак 11).

Раённы краязнаўчы музей носіць імя Ф.Багушэвіча. [8]

**Прыпынак трэці: аг.Станцыя Ашмяны - в. Дакурнішкі**

Адлегласць ад аг.Жупраны да аг.Станцыя Ашмяны і в. Дакурнішкі - 6,8 км; час –17 хвілін.

У Дакурнішскай школе знаходзіцца краязнаўчы музей, у якім можна даведацца пра гісторыю мясцовай чыгуначнай станцыі.

Аграгарадок Станцыя Ашмяны і вёска Дакурнішкі знакаміты імёнамі паэтаў - Эдварда Сяргея і Анатоля Кавалеўскага.

**Эдвард Сяргей.** Нарадзіўся ў вёсцы Анкуды Ашмянскага раёна. Тут скончыў базавую школу. Жыве з сям'ёй на станцыі Ашмяны. Разам з жонкай выхоўвае дачку Дзіяну.

Родны край, мясцовыя людзі, іх звычаі і ўклад жыцця сталі жыватворнай крыніцай для творчасці паэта. Захапляецца паэзіяй Сяргея Ясеніна і Уладзіміра Высоцкага.

**Анатоль Кавалеўскі.** Нарадзіўся ў 1933 годзе ў г. Віцебску. У Ашмянскім раёне жыве з 1945 года. Скончыў сярэднюю школу ў г. Ашмяны. Служыў у арміі. З 1959 года працаваў Дакурнішскай СШ настаўнікам. Цяпер на пенсіі. Пісаць пачаў у 50-я гады мінулага стагоддзя. Друкаваўся у раённай, рэспубліканскіх газетах. [6] (Дадатак 12).

**2.2 Маршрут другі “Барунскі”**

Баруны, Гейстуны –
Узор старажытны па праву.
Увайшлі яны ўсе ў радаслоўнае дрэва,
Набыўшы сусветную славу.

Ашмяны - Навасёлкі - Гінеўцы – Баруны - Гейстуны.

Агульная адлегласць - каля 73 км.

Агульны час – 182 хвіліны, або 3 гадзіны 2 хвіліны.

**Прыпынак першы: аг.Навасёлкі**

Адлегласць ад г. Ашмяны - каля 10 км; час - 25 хвілін.

У вёсцы жыве Алена Місюк – былая настаўніца беларускай мовы і літаратуры Навасёлкаўскай школы, аўтар шматлікіх вершаў, член некалькіх мясцовых літаратурных аб’яднанняў.

Вершы А. Місюк пачала пісаць яшчэ ў школьным узросце. Тэматыка вершаў Алены Вікенцьеўны вельмі разнастайная. Гэта вершы аб прыродзе, жыцці, шчасці, аб роднай беларускай мове. Вершы А.Місюк прысвячае сваім калегам, выпускнікам, аднавяскоўцам, сваім родным.

Бо нашы дзеці – наша шчасце,
Бо нашы дзеці – наш працяг.
Хай абмінаюць іх напасці,
Хай азарыць ім Сонца шлях!

Друкуецца на старонках раённай газеты “Ашмянскі веснік”. [6] (Дадатак 13).

**Прыпынак другі: в. Гінеўцы**

Адлегласць ад аг.Навасёлкі - 10 км; час - 25 хвілін.

У мясцовай вёсцы жыве і працуе Ірына Ізбіцкая - аўтар шматлікіх літаратурных твораў.

Ірына Ізбіцкая нарадзілася ў вёсцы Біскупцы Лідскага раёна. Пасля заканчэння школы паступіла ў Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум. З 1982 года працуе ў Гінеўскай сельскай бібліятэцы.

Вершы пачала пісаць яшчэ ў школьным узросце. Паэзія з'яўляецца яе верным сябрам і аднадумцам. Яна прыцягвае чытачоў шчырасцю і адкрытасцю. Кожны радок яе вершаў напоўнена любоўю да Радзімы, сваіх родных і блізкіх, непаўторным кутках беларускай прыроды. [6] (Дадатак 14).

Бацькоўская хата чакае
З далёкіх і блізкіх дарог.
Бацькоўская хата прымае
Блудных дзяцей на парог.

**Прыпынак трэці: в. Баруны**

Адлегласць ад в. Гінеўцы - 9 км; час - 23 хвіліны.

У мясцовасці знаходзяцца турыстычныя аб’екты: касцёл святых апосталаў Пятра і Паўла, цудатворны абраз Маці Божай Барунскай, помнік воінам Першай сусветнай вайны.

**Прыпынак чацвёрты: в. Гейстуны**

Адлегласць ад в. Баруны - 7 км; час - 18 хвілін.

Тут у 1804 годзе нарадзіўся Антоній Адынец – паэт, перакладчык, мемуарыст, сябар Адама Міцкевіча. Вучыўся А. Адынец у павятовай базыльянскай школе ў Барунах.

Сваю паэтычную дарогу пачаў ён даволі рана, яшчэ ў Барунскай школе. Сапраўдную папулярнасць прынесла яму «Песня філарэтаў».

Найбольш каштоўным творам у спадчыне А. Адынца крытыка прызнала напісаныя ў 1875-1878 гг. «Пісьмы з падарожжа», даволі падрабязныя, з важнымі дэталямі і фактамі ўспаміны пра падарожжа ў 1829-1830 гг. з Адамам Міцкевічам па Еўропе. Вельмі добра дапаўняе «Пісьмы...» і кніга «Успаміны з мінулага», якая была напісана А. Адынцом на схіле жыцця і ў якой шмат цікавага, пазнавальнага пра мінулае нашай зямлі. [2] (Дадатак 15).

**2.3 Маршрут трэці"Шляхам жыцця"**

Вядомы зямляк наш – філосаф Снядэцкі,
Што быў Вельбутова ўладальнік.
Ён выгляд і сан меў заўсёды шляхецкі,
У хімію стаў укладальнік.

Ашмяны - Навасяды - Кальчуны - Мардасы - Вайшнарышкі.

Агульная адлегласць - каля 50 км.

Агульны час – 128 хвілін, або 2 гадзіны 8 хвілін.

**Прыпынак першы: в. Навасяды**

Адлегласць з г. Ашмяны да в. Навасяды - 5 км; час - 13 хвілін.

Вёска Навасяды – малая радзіма Аляксандра Астрамовіча (псеўданім Андрэй Зязюля). Гэта каталіцкі святар, паэт. Першы верш «Песня дзяўчаці» пад псеўданімам Андрэй Зязюля паэт апублікаваў у газеце «Наша Ніва» ў 1909 годзе. З'яўляецца аўтарам асветніцкай паэмы «Слова праўды аб мове і долі беларуса» (Прага, 1917), беларускага рэлігійнага гімна "Божа, што калісь народы…" ("Песня Беларусі").

Узглянь жа на народ бяздольны
Беларускі, што к Табе
Голас ціхі, паднявольны
У пакорнай шле мальбе.

Андрэй Зязюля збіраў народныя песні, якія разам з запісамі Антона Грыневіча склалі зборнік «Беларускія песні з нотамі» (Пецярбург, 1912).

Любоў да Беларусі шчыра праявілася ў нізках вершаў «Народныя», «Народнае жыццё», «Беларуская прырода», «Родная сяліба», у паэме «Аленчына вяселле». У лірычным цыкле «Беларуская прырода» паэт апявае прыгажосць кожнага месяца вясны, лета, восені і зімы, красу роднага хутара, поля, роднай дзяўчыны і роднай песні.

Усе творы паэта-святара – гутаркі настаўніка з духоўнымі дзецьмі. Сутнасць яго багаслоўя і філасофіі можна вызначыць коратка – любоў да Бога і

любой Божай істоты, найперш – да Беларусі, роднага народа, беларускай мовы, культуры. Гэта любоў праявілася ўжо ў назве зборніка «З роднага загону». Родны загон для паэта быў тою зоркаю, з вышыні якой ён хацеў абняць увесь Божы свет.

На жаль, імя гэтага таленавітага чалавека мала вядома ў Беларусі. Яго творы не змешчаныя ў школьных падручніках, не выходзяць шматтысячнымі тыражамі. [10, с.20] (Дадатак 16).

Сучасная паэтэсса Генуэфа Кеўра вершы пачала пісаць з малых гадоў. Генуэфа Францаўна ўспамінае, што бацька кожны вечар чытаў дзецям вершы, расказваў казкі. Піша вершы пра сваю малую радзіму, каханне і жыццё. Часта друкуецца ў раённай газеце “Ашмянскі веснік”. [6] (Дадатак 17).

У неба хочуць вышэй узняцца,
Адлятаюць у вырай гусі,
А я ў каханні хачу прызнацца
Дарагой маёй Беларусі.

**Прыпынак другі: аг. Кальчуны**

Адлегласць ад в. Навасяды - 3 км; час - 8 хвілін.

Ва ўстанове адукацыі "Кальчунская сярэдняя агульнаадукацыйная школа" з 2004 г. працуе гісторыка-краязнаўчы музей. Музей створаны ў гонар земляка Енджэя Снядэцкага (1768-1838), з жыццём і дзейнасцю якога звязана гісторыя Ашмянскага краю.[5]

Енджэй Снядэцкі - сусветна вядомы вучоны эпохі Асветы, прафесар Віленскага ўніверсітэта, заснавальнік Віленскага медыцынскага грамадства. Свой талент навуковец выявіў у розных галінах навукі: хіміі, біялогіі, медыцыне, біяхіміі, педагогіцы, літаратуры. Енджэй Снядэцкі - аўтар больш за сямідзесяці навуковых прац (Дадатак 18).

**Прыпынак трэці: в. Мардасы**

Адлегласць ад в. Кальчуны - 4 км; час - 10 хвілін.

У вёсцы нарадзіўся і жыве Ігар Спірыдовіч, які ўсё сваё жыццё стварае самае прыгожае, што можа тварыць чалавек, - паэзію. Шмат піша баек Сваю першую байку напісаў у трэцім класе. Героі яго баек узяты з жыцця. Ён можа тонка пасмяяцца не толькі над чужымі заганамі, але і ўласнымі (“Жончына навука”, “Пляткарка”). У паэтычным сшытку аўтара шмат філасофскіх разважанняў, патрыятычна-грамадзянскай і інтымнай лірыкі.

Не будзі мяне, мама, наранку,
Я цябе не прашу, а малю,
Бо сваю чарнавоку-каханку
Толькі раніцай я і прысню.

Не абмінае творца тэму Вялікай Айчыннай вайны, падзей у Афганістане, павагі да свайго краю і продкаў. [6] (Дадатак 19).

**Прыпынак чацвёрты: в. Вайшнарышкі**

Адлегласць ад в. Мардасы - 13 км; час - 33 хвіліны.

Тут жыве і стварае свае творы Ядзвіга Чаплінская. (Дадатак 20).

Яе паэтычныя радкі прысвечаны, чалавечай дабрыні, родным караням, прыгажосці беларускай зямлі [6].

Ашмяншчына мая, куточак родны,
Такі прыветны і лагодны.
Ты ў майскай квецені прыгожы,
А ў час жніва пах яблыкаў і збожжа
Мяне з усіх дарог сюды пакліча,
Бо тут усё знаёма і прывычна.

Паэтэса з’яўляецца лаўрэатам абласнога конкурсу да 90-годдзя Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі «Поэзия – души движенье», пераможца раённага конкурсу патрыятычнай песні сярод установ адукацыі ў намінацыі “Вольная тэма”, удзельніца літаратурнага пленэру “Паэтычная вясна” у Літве. З 1991 г. друкуецца на старонках раённай газеты “Ашмянскі веснік”. Вершы Я.Чаплінскай уключаны ў зборнік “Сустрэчы”, выдадзены ў рамках міжнароднага праекта “Два бакі – адна гісторыя і культура”. Аўтар зборніка вершаў “Мелодыі маёй душы” (2015).

**2.4 Маршрут чацвёрты “Да руінаў старажытнасці”**

Бяскрайнасць і няўрымслівасць аблокаў,
Бязмежнасць і расхрыстанасць палёў.
Гальшаны. Манастыр. У цемры крокі.
Гальшаны. Замак. Вецер і галлё.

Ашмяны - Гальшаны - Маркіняты.

Агульная адлегласць - каля 57 км.

Агульны час – прыблізна 143 хвіліны, або 2 гадзіны 23 хвіліны.

**Прыпынак першы: аг.Гальшаны**

Адлегласць ад г. Ашмяны - 21,6 км; час – 54 хвіліны.

Тут жыў Вінцук Адважны (сапр. Германовіч Язэп Станіслававіч) - беларускі пісьменнік, каталіцкі святар, паэт, публіцыст.

У 1921 годзе ўступіў у Таварыства беларускай школы; арганізаваў адну з беларускіх школ, у касцёле гаварыў казанні на беларускай мове. Гэта выклікала незадаволенасць найвышэйшай іерархіі, і В.Адважны вымушаны быў пераехаць у Друю, дзе ў 1924 годзе ўступіў у ордэн марыянаў. Пачаткова выконваў абавязкі пробашча Друйскай парафіі, пазней быў магістрам навіцыяту

ў Друйскім кляштары марыянаў і, акрамя таго, настаўнікам рэлігіі і лацінскай мовы ў Друйскай гімназіі. Шырока выступаў у беларускім перыядычным друку. Празаічныя і паэтычныя творы В. Адважнага рэгулярна з’яўляліся на старонках перыядычнага друку («Kryniсa», «Chryścijanskaja Dumka»). Пераследаваўся польскімі свецкімі і духоўнымі ўладамі.

Прымаў удзел у рэлігійным і культурным жыцці беларускага замежжа. Рэдагаваў часопіс «Божым шляхам» (Лондан). Пра сваё знаходжанне ў лагерах напісаў успаміны «Кітай — Сібір — Масква», якія выклікалі вялікую цікавасць, былі апублікаваныя на беларускай, італьянскай, польскай, літоўскай мовах. [5] (Дадатак 21).

**Другі прыпынак в. Маркіняты**

Адлегласць ад аг.Гальшаны - 8 км; час – 20 хвілін.

У вёсцы нарадзілася Валянціна Ліштван. Вучылася ў Міхайлоўшчынскай базавай школе, затым у Гродзенскім вучылішчы мастацтваў на аддзяленні харавога дырыжыравання. Музычны слых і паэтычны дар атрымала ў спадчыну ад бацькі Вацлава Канстанцінавіча. Шмат гадоў аддала працы у розных установах.

Вольны час прысвячае напісанню вершаў. Большасць з іх пра Радзіму, бацькоў, пра тыя месцы, дзе прайшло яе дзяцінства. [6] (Дадатак 22).

Дзе спеў птушыны абуджае гай,
Дзе па-сіроцку апусцелі хаты –
Там самы любы і прыгожы край,
Мая Радзіма – вёска Маркіняты.

## Заключэнне

Каштоўнасць велавандровак складаецца ў тым, што ў працэсе іх рэалізацыі ёсць магчымасць пазнаёміцца з літаратурнай спадчынай Ашмяншчыны.

Здзейсніўшы экскурсію па дадзеных маршрутах, мы зрабілі наступныя высновы:

1. Вывучаны асобныя старонкі з гісторыі Ашмяншчыны з літаратурнага боку.

2. Была сабрана і сістэматызавана інфармацыя пра паэтаў Ашмяншчыны са сродкаў масавай інфармацыі і інтэрнэта.

3. Распрацаваны чатыры літаратурныя веламаршруты.

4. Робячы прыпынак па веламаршруце, падарожнік мае магчымасць прагледзець відаэролікі і фотаздымкі той ці іншай мясцовасці і паэтаў, праслухаць творы мастакоў слова з дапамогай уласных мабільных сродкаў, зайшоўшы на сайт ДУА “Сярэдняя школа №3г. Ашмяны” (http://sch3.byethost6.com/), атрымаць усю неабходную інфармацыю і выбраць цікавы для яго маршрут.

5. Вандроўкі па веламаршруце спрыяюць павышэнню цікавасці да вывучэння і чытання мастацкіх твораў паэтаў Ашмяншчыны і прыцягненню ўвагі сучаснага пакалення да здаровага ладу жыцця.

6. Інфармацыя з комплексу і сам сайт могуць быць выкарыстаны на ўроках беларускай літаратуры пры вывучэнні жыцця і творчасці Ф. Багушэвіча і сучаснай беларускай літаратуры ў старэйшых класах, а таксама пры планаванні шостага школьнага дня, пры правядзенні літаратурных сустрэч, экскурсій сумесна з законнымі прадстаўнікамі вучняў. Можа быць выкарастаны пры арганізацыі экскурсій для турыстаў. (Дадатак 23-27)

8. З мэтай папулярызацыі комплексу размешчаны публікацыі ў СМІ, аформлены буклеты, якія распаўсюджаны ва ўстановах адукацыі Ашмянскага раёна. Акрамя таго, матэрыялы актыўна выкарыстоўваецца чытачамі Цэнтральнай раённай бібліятэкі.

9. Дбайнае збіранне літаратурнай спадчыны важна для захавання памяці пра пісьменнікаў і паэтаў, якія ўславілі Ашмяншчыну. Дадзены работа будзе мець працяг: адкрыццё новых імёнаў у сучаснай мясцовай літаратуры, стварэнне новых веламаршрутаў.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Антановіч, К. // У Барунах па каралеўскім прывілеі// “Культура” №18, 2010 г.

2. Беларуская Палічка: http:// www.knihi.com.

3. Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 15: Следавікі — Трыа/ Рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. — Мн.: БелЭн, 2002. — 552 с.: іл. ISBN 985-11-0251-2 (т. 15), ISBN 985-11-0035-8.

4. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX ст.: Жыццярысы, мартыралогія, успаміны / уклад.: Ю. Гарбінскі. — Мн.-Мюнхен: Беларускі кнігазбор, 1999

5. Вікіпедыя. https://be.wikipedia.org/wiki.

6. Газета “ Ашмянскі веснік”. oshvest@mail.grodno.by.

**7.** Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Дакурнішскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад-сярэдняя школа". https://upk-dokurnishki.schools.by.

8. Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Жупранскай сярэдняя школа імя Ф.К.Багушэвіча» А.Г. Жупраны. https://zhuprany.schools.by

9. Збор помнікаў гісторыі і культуры: Гродзенская вобласць / АН БССР; Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Беларуская савецкая энцыклапедыя; Рэдкалегія: С. В. Марцэлеў (галоўны рэдактар), М. М. Бірукова, М. В. Бірыла і іншыя. — Мн.: БелСЭ, 1986.

10. Конан, У. Андрэй Зязюля: хрысціянская філасофія і асветніцкая дзейнасць // Наша вера. — 2001. — № 4. — С. 18–23.

11. Лойка, А. А. Андрэй Зязюля // Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд: у 2 ч. — Ч. 2: Падручнік для філал. фак. ВНУ. — Мінск, 1989. — С. 445–451.

12. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна. – Мн.: БЕЛТА, 2003. - 688 с.: іл.

13. Саламевіч Я. Паэт-святар Андрэй Зязюля // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1991. № 7-8. С. 140—144.

14. Цвірка, К. Тэлемак з-пад Ашмянаў. Жыццё і творчасць Антонія Эдварда Адынца// Роднае слова. – 1994. - №3. – С. 7.

15. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 т. Т.1: А – Беліца/Беларуская энцыклапедыя.

Дадатак 1

1. Ашмяны - Паляны - Жупраны - Станцыя Ашмяны - Дакурнішкі.
2. Ашмяны - Навасёлкі - Баруны - Гінеўцы - Гейстуны.
3. Ашмяны - Навасяды - Кальчуны - Мардасы - Вайшнарышкі.
4. **Ашмяны - Гальшаны - Маркіняты.**



Дадатак 2

## Славутасці




Дадатак 3

## Відэа



Дадатак 4




Дадатак 5




Дадатак 6



Дадатак 7




Дадатак 8




Дадатак 9



Дадатак10

## Аграгарадок Жупраны – месца захавання Ф.Багушэвіча




Дадатак 11

## Літаратурны музей Ф.К. Багушэвіча ў мясцовай школе





Дадатак 12

## Паэты: Эдвард Сяргей і Анатоль Кавалеўскі




Дадатак 13



Дадатак 14



Дадатак 15



Дадатак 16



Дадатак 17



Дадатак 18



Дадатак 19



Дадатак 20



Дадатак 21



Дадатак 22



Дадатак 23



Дадатак 24



Дадатак 25



Дадатак 26



Дадатак 27

